

# Энтузіязм як стратэгія керамістаў



**У сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" прайшла выстава "Кола агню" — вынік работы VI Міжнароднага пленэру па кераміцы "Арт-жыжаль". Ужо традыцыйная для гэтай галерэі выстаўка дала падставу грунтоўна асэнсаваць стан і праблемы развіцця мастацкай керамікі ў Беларусі.**



У межах выставы адбылася навукова-творчая канферэнцыя "Класіка і авангард беларускай керамікі", праведзеная ў канферэнц-зале бібліятэкі БДУ культуры і мастацтваў. Прысутныя падкрэслілі надзвычай важную ролю ў мастацкім працэсе нашай краіны пленэраў па кераміцы "Арт-жыжаль", адзначылі іх няўтомнага арганізатара Валерыя Калтыгіна. Сам жа майстра не звяртае ўвагу на ўхвальныя эпітэты і даволі крытычна ставіцца да кампліментаў, хаця і заслужаных. Валерый Калтыгін бачыць пэўную небяспеку ў тым, што пленэр вычэрпвае свой тэхналагічны рэсурс.

Але ж галоўным рэсурсам пленэру з'яўляюцца найперш людзі. I майстры, і моладзь, для якой такая праца становіцца сапраўднай школай майстэрства. Школай, дзе можна пераняць унікальны вопыт і ўменні старэйшых калег. Неацэнны досвед працы з "адкрытым полымем", спасціжэнне тэхналагічных сакрэтаў працы з шамотам, палівамі, абварамі... І ў выніку — узбагачэнне мастацкай скарбонкі "Арт-жыжаля" новымі ідэямі, пластычнымі і каларыстычнымі здабыткамі. Дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладногa мастацтва БДУКіМ, вядомая керамістка, арганізатар канферэнцыі Тамара Васюк адзначыла шэраг выхаванцаў сваёй кафедры, якія ўдзельнічалі ў пленэрах "Арт-жыжаля". Кастусь Цітоў, Алег Ткачоў, Павел Пазнякоў ды іншыя заявілі пра сябе не толькі як таленавітыя маладыя мастакі, але ж і як камерцыйна паспяховыя асобы, якія зарабляюць на жыццё менавіта керамікай. Таксама вылучыліся ўдзельнікі пленэраў — выхаванцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: Ірына Шчасная, Любоў Баразна, Алена Чэпелева... Дарэчы, Валерый Калтыгін адзначыў, што ён ахвотна прымае да ўдзелу ў пленэрах выхаванцаў БДУ культуры і мастацтваў, БДАМ, Магілёўскага вучылішча культуры. Галоўная ўмова адбору — малады кераміст павінен быць прафесійна падрыхтаваны і гатовы да цяжкай, напружанай працы. Сапраўды, некаторыя абпалы заканчваюцца далёка занач, а з ранку трэба зноў уключацца не толькі ў творчы працэс, але і ў тэхналагічныя работы па абслугоўванні печаў і г.д. Таму на пленэры няма месца гультаям і людзям са слабай фізічнай падрыхтоўкай.

Доктар мастацтвазнаўства Валерый Жук у сваім выступленні акрэсліў асноўныя праблемы мастацкай керамікі. Напрыклад, пры закупках для музеяў творы керамікі ацэньваюцца на парадак ніжэй за жывапіс ці графіку. А матэрыяльных і фізічных затрат на керамічны твор ці мастацкі твор са шкла патрабуецца нашмат болей, чым на стварэнне, напрыклад, работы ў тэхніцы алейнага жывапісу, ужо не кажучы пра акварэль. Таксама В. Жук падкрэсліў залежнасць керамікі ад поглядаў на архітэктуру. Напрыклад, ён прыгадаў 1970-ыя гады — "залатыя часы" керамікі, калі існавала мода на керамічныя інтэр'еры. Керамічнымі пано аздаблялі кафэ, рэстараны, клубы, кінатэатры, грамадскія ўстановы. Сёння ў нашай прасторы, і, што самае горшае, у галовах заказчыкаў, пануе так званая "еўрабудоўля", якая не мае кропак судакранання з прыроднымі матэрыяламі, і з глінай у першую чаргу. Заўважу, што ў асяроддзі бізнесоўцаў моднымі цяпер з'яўляюцца творы з іржавага металу, якія, вядома ж, маюць права на існаванне. Ды і творы "Арт-жыжаля" часам нагадваюць эстэтыку постіндустрыяльнай металапластыкі. Сёння неадкладнай задачай керамістаў з'яўляецца папулярызацыя, "піяр" сваіх дасягненняў, увядзенне іх віду творчасці ў кантэкст сучаснага мастацтва.

На канферэнцыі гаварылася не толькі пра стан мастацкай керамікі, былі закрануты і праблемы керамікі прамысловай. Сваімі назіраннямі пра нялёгкае становішча керамістаў-прамыслоўцаў падзяліўся Міхаіл Казярог, галоўны тэхнолаг знакамітага завода ў Івянцы. Але ж выступленні мастацтвазнаўцаў унеслі ў ход абмеркавання аптымістычны настрой. Яўген Шунейка выказаў упэўненасць, што выратуюцца мастакі-керамісты менавіта энтузіязмам. Яго падтрымала Таццяна Гаранская — канкрэтнымі прыкладамі творчасці мастакоў, якія не чакалі хуткага поспеху, а самааддана працавалі і дасягалі ў выніку плёну. Кераміка — насамрэч высокае мастацтва, здатнае адлюстраваць не толькі побытавыя ці гумарыстычныя тэмы, але і выказаць сапраўдную трагедыю. Такая выснова прагучала ў выступленні мастацтвазнаўцы Ларысы Фінкельштэйн, якая падсумавала вынікі канферэнцыі.

**Дзяніс БАРСУКОЎ**

***На здымках: работы беларускіх керамістаў розных гадоў.***

***Фота Святланы Берасцень***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ